*Л.Г. Бараноўская* (Магілёў)

# УВАСАБЛЕННЕ АНІМАЛІСТЫЧНЫХ ВОБРАЗАЎ У ТВОРЧАСЦІ Я. КОЛАСА
## (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЕРША “НА НІВЕ”)

Станаўленне мастацкай анімалістыкі ў беларускай літаратуры XX стагоддзя найперш звязана з увасабленнем свойскіх жывёл. Адзін з адметных анімалістычных вобразаў у творчасці Я. Коласа – конь. Адзначым, што для абраднасці славянскіх народаў быў улас-

цівы культ каня[1], які быў адной з самых шанаваных жывёл у духоўным жыцці чалавека. Між тым вобраз каня шматзначны ў міфалогіі і фальклоры індаеўрапейскіх народаў [2].

Вядома, што адной з фальклорных крыніц, дзе сустракаюцца анімалістычныя вобразы, з'яўляюцца казкі пра жывёл. У іх, паводле назіранняў І. Крука, вобраз каня сустракаецца даволі рэдка: "Конь не стаў папулярным героем казак пра жывёл, мабыць, таму, што ён быў уласнасцю не толькі земляробца, але і воіна" [4, с. 65]. Вобраз каня даволі пашыраны ў чарадзейных казках. Конь тут выконвае функцыю памочніка героя ў яго паходах, подзвігах ("Іван-дурак дванаццаць кабыліц пасвіў", "Залатое пяро").

Прыпадабняючы адны з'явы да другіх і параўноўваючы іх паміж сабой, нашы продкі бачылі аналогіі там, дзе сучасны чалавек заўважае іх з цяжкасцю. Так, імклівы рух ветру, маланкі, грому, вады і каня ўспрымаліся аналагічнымі, здольнымі замяніць адзін аднаго. "Такое ж уражанне хуткага руху, якое парадніла стыхійныя з'явы з птушкамі, прымусіла зблізіць іх з легканогім канём... <...> Таму ўсе з'явы прыроды, якія ўяўляюцца птушкамі, персаніфікаваліся і ў вобразе цудоўных коней", – адзначае А. Афанасьеў [1, с. 143]. Адносна мастацкай творчасці М. Эпштэйн заўважае: "Значэнне каня ў лірычнай паэзіі вызначаецца не толькі старажытнасцю міфалагічных традыцый, у якіх іншыя жывёлы – карова, авечка, змяя, воўк, мядзведзь – адыгрываюць не менш значную ролю. Галоўнае – не тыя прыродныя стыхіі, якія персаніфікуюць каня, а магчымасць лірычнага героя ўладарыць над імі пры дапамозе каня" [5, с. 93]. Такое ўвасабленне вобраза гэтай хатняй жывёлы ў дынаміцы ўпершыню сустракаецца ў беларускай класічнай паэзіі ў творчасці М. Багдановіча: "<...> У белай пене праносяцца коні, // Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць <...>" ("Пагоня" [2, с. 314]). Паступова вобраз каня ў беларускай літаратуры трансфармаваўся і набыў іншае сэнсавае гучанне ў раманах "Бацькаўшчына" К.Чорнага, "Вязьмо" М. Зарэцкага. Гэта не проста памочнік героя ў пэўных яго гераічных учынках,

[1] Пра значнасць гэтай жывёлы для беларусаў сведчыць той факт, што яму надаецца вялікая ўвага ў пахавальным абрадзе. Косткі прадстаўнікоў фауны траплялі ў курганы ў якасці ахвяр нябожчыку, не менш як рэшткі трызны. Самыя раннія і найбольш распаўсюджаныя з гэтых знаходак – захаванні каня. На тэрыторыі Беларусі фауністычныя знаходкі сустракаюцца ў старажытных курганах.

[2] Так, у індаеўрапейскай міфалогіі гэты вобраз прыбліжаны і да багоў (у гэтым сэнсе вобраз каня звязаны з салярным культам, вобраз бога сонца на кані з'яўляецца агульным для індаеўрапейскіх народаў), а часам і да чалавека (кентаўр). У беларускай міфатворчасці вобраз каня звязаны з яго апекуном – Ярылам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

а і спадарожнік беларуса-земляроба; ён разам з чалавекам-працаўніком дзеліць яго надзённыя клопаты па гаспадарцы. Прыкладам таму можа служыць вобраз каня ў аповесці "Адшчапенец" Я.Коласа.

У цэлым, у творах Я.Коласа даюцца рэалістычныя апісанні гэтай жывёлы. Напрыклад, у вершы "На ніве" Я. Коласа: "Гэй, мой конік! Гэй, мой сівы! // Ну яшчэ, маленькі! // Варушыся, гэй, не бойся, // Конік мой сівенькі! – // Зранку ў полі за сахою // Аратай гукае, // Сіўку, друга ў цяжкай працы, // Просіць-панукае" [3, с. 294]. Разам з тым вобраз каня з'яўляецца сімвалам сялянскай гаспадаркі, працавітасці беларуса. У вершы праводзіцца паралель паміж земляробчай доляй селяніна і лёсам яго памочніка: "А аратай, задуменны, // Зноў ідзе ступою... // Моцна, моцна іх злучыла // Праца за сахою! / / – Гэй, мой коцік! Но, мой мілы! – // Носіцца па полі. // Конік, сошка і аратай // Сунуцца паволі" [3, с. 294]. Вобразы аратага і яго каня адлюстраваны таксама ў творчасці Я. Купалы (верш "Араты"), М. Ганчарыка (верш "Араты") і інш.

Такім чынам, аналіз вобраза каня ў вершы "На ніве" Я. Коласа, дае падставы сцвярджаць наступнае.

Па-першае, вобраз каня займае значнае месца ў мастацкай свядомасці беларусаў, таму як ў фальклорных творах, так і ў літаратурных часта функцыянуе як архетыпічны, нясе вялікую сэнсавую нагрузку.

Па-другое, у творах гэтага пісьменніка вобраз каня сустракаецца ў асноўным пры апісанні вясковага пейзажу.

Па-трэцяе, для гэтага вобраза характэрны дуалістычны падыход. З аднаго боку, конь выступае сябрам, спадарожнікам чалавека, з другога боку, гэта сімвалічны вобраз беларуса-земляроба.

***Літаратура***


1. Афанасьев А.Н. Древо жизни: Избр. ст. / Подг. текста и коммент. Ю.М. Медведева / А.Н. Афанасьев. – М.: Современник, 1982. – 464 с.
2. Багдановіч М. Поўны збор твораў: У 3 т. / М. Багдановіч; пад рэд. А.А. Лойкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 752 с.
3. Колас Я. Збор твораў: У 14 т. / Я. Колас. – Мінск: Маст. літ., 1961. – Т. 1. Вершы 1898 – 1917. – 560 с.
4. Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2000. – 350 с.
5. Эпштейн М.Н. Природа, мир, тайник вселенной...: Система пейзаж. образов в рус. поэзии / М.Н. Эпштейн. – М.: Высш. шк., 1990. – 303 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова